Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

DOI:10.17951/sb.2023.17.259-275
Studia Białorutenistyczne 17/2023 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Alena Rudenka

Institute of Slavic Studies, Polish Academy of Sciences (Poland)
e-mail: alena.rudenka@ispan.edu.pl
https://orcid.org/0000-0002-1165-3299

Беларус, беларускі: гісторыя найменняў айчыны і суайчыннікаў*

Belarus, Belarusian: the History of the Names of the Homeland and Countrymen

Białoruś, białoruski: historia nazw ojczyzny i rodaków

Abstract

The research is based on two concepts: 1) a stable ethnic name (ethnonym) testifies to the strong ethno-identity of people, and changes in this name indicate changes in ethnic self-consciousness of the group; 2) the name of the language used by the ethnos (linguonym), as well as the ethnonym, is very significant for ethnic identity, and a stable linguonym and its formation is more important for the mentality of people than intra-linguistic changes. The purpose of the article is to show the stages of the formation of the names of Belarusians and the Belarusian language. This goal cannot be realized without referring to the formation of the ethnic identity of Belarusians. Since the diachronic approach is adopted, the necessary historical-geographical and linguistic context is given. The study applies methods of working with text: both with scientific literature and with original texts in the field of issues. The information from these two types of sources is used to show the stages of the formation of Belarusian ethnonyms and linguonyms. The synthesis and final interpretation were also carried out through the extralinguistic (first of all, historical) perspective. The formation of the names of the concept of "homeland" was also considered. As a result of the research, the author comes to conclusion that at the beginning of the 20th century Belarusians had already formed the names of their homeland, ethnos and language, that is, for more than a hundred years they considered themselves a separate nation.

Keywords: Homeland, Belarusian, the Belarusian language, ethnonym, linguonym

* NCBR*Тэкст створаны ў рамках праекта, які фінансуецца Нацыянальным цэнтрам даследавання і развіцця па праграме „Салідарныя з навукоўцамі [Solidarni z naukowcami]" (Narodowe Centrum Badań i Rozwoju, Polska), грант №. SzN/I/OJCZOBEL/02/2022.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Abstrakt

Badania opierają się na dwóch koncepcjach: 1) stabilna nazwa etniczna (etnonim) świadczy o silnej tożsamości etnicznej ludu, a zmiany w tej nazwie wskazują na zmiany w samoświadomości grupy. 2) Nazwa języka, którym posługuje się etos (lingwonim), podobnie jak etnonim, ma duże znaczenie dla tożsamości etnicznej, a stabilny lingwonim i jego ukształtowanie są ważniejsze jest dla mentalności ludzi niż zmiany wewnątrzjęzykowe. Celem artykułu jest ukazanie etapów powstawania nazwy Białorusinów i języka białoruskiego. Celu tego nie da się zrealizować bez odniesienia się do kształtowania tożsamości etnicznej Białorusinów. W artykule przyjęto podejście diachroniczne, więc podany został niezbędny kontekst historyczno-geograficzny i językowy. W opracowaniu zastosowano metody pracy z tekstem: zarówno z literaturą naukową, jak i z oryginalnymi tekstami z zakresu problematyki. Informacje z tych dwóch typów źródeł służą do pokazania etapów kształtowania się białoruskich etnonimów i lingwonimów. Syntezy i ostatecznej interpretacji dokonano także w perspektywie ekstralingwistycznej (przede wszystkim historycznej). Zastanawiano się także nad kształtowaniem się poszczególnych nazw ojczyzny. W wyniku przeprowadzonych badań autorka przychodzi do przekonania, że na początku XX w. Białorusini mieli już ukształtowane nazwy ojczyzny, etosu oraz języka, oznacza to, że od ponad stu lat uważają się za osobny naród.

Słowa kluczowe: ojczyzna, Białorusin; język białoruski, etnonim, lingwonim

Анатацыя

У аснове даследавання ляжаць дзве ідэі: 1) устойлівая этнічная назва (этнонім) сведчыць аб моцнай этнаідэнтычнасці народу, а змены гэтай назвы – аб зменах у яго этнічнай самасвядомасці; 2) назва мовы, на якой размаўляе этнас (лінгвонім), як і этнонім, мае вялікае значэнне для этнічнай самасвядомасці, а ўстойлівы лінгвонім і яго фарміраванне больш важныя для менталітэту народа, чым унутрымоўныя змены. Мэта артыкула – прасачыць утварэнне назваў беларускага этнасу і беларускай мовы. Паколькі выкарыстоўваецца дыяхранічны падыход, даецца неабходны гісторыка-геаграфічны і лінгвістычны кантэкст. У даследаванні прымяняюцца метады работы з тэкстам: як з навуковай літаратурай, так і з арыгінальнымі тэкстамі па праблеме. Звесткі з гэтых двух тыпаў крыніц выкарыстоўваюцца для паэтапнага мадэлявання шляху ўтварэння беларускіх этнонімаў і лінгвонімаў. Сінтэз і канчатковая інтэрпрэтацыя ажыццяўляліся і пры дапамозе экстралінгвістычных (найперш гістарычных) звестак. Разглядалася таксама станаўленне назваў айчыны. У выніку даследавання аўтарка прыходзіць да высновы, што на пачатку XX ст. беларусы мелі ўжо ўстойлівыя найменні айчыны, этнасу, мовы – значыць, больш за стагоддзе бачаць сябе самастойным народам.

Ключавыя словы: айчына, беларус, беларуская мова, этнонім, лінгвонім

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Уводзіны

Дадзены артыкул прысвечаны фарміраванню найменняў беларускага этнасу і беларускай мовы. Гэтая мэта не можа быць рэалізаваная без звароту да станаўлення этнічнай ідэнтычнасці беларусаў, з аднаго боку, а з другога боку – да фарміравання самой іх мовы. Па названых тэмах існуе вялікая навуковая літаратура, таму поўнасцю пазбегнуць рэфератыўнасці немагчыма.

Гісторыя беларускай мовы разглядаецца ў першую чаргу ў акадэмічных і ўніверсітэцкіх выданнях, а таксама ў працах асобных аўтараў, напрыклад В. Свяжынскага (Svâžynskì, 2001). Станаўленню этнічнай ідэнтычнасці беларусаў (дыяхранічны аспект) прысвечаны артыкулы Сяргея Плахія (Plokhy, 2006), Генадзя Сагановіча (Saganovìč, 2018), Цімаці Снайдэра (Snayder, 2003) і інш.

Факты і гіпотэзы аб развіцці беларускай мовы выкладаюцца ў гэтым артыкуле максімальна коратка, паколькі гэтая тэма павінна асвятляцца асобна. Таксама мы пазбягалі і глыбокага пранікнення ў праблемы станаўлення этнаідэнтычнасці беларусаў: гэта вялізны сацыялагічны матэрыял, які патрабуе асобнай увагі. Пытанні ідэнтычнасці беларусаў пададзены ў артыкуле ў межах неабходнага мінімуму ў гісторыка-геаграфічным і этнічным аспектах.

Артыкул грунтуецца на наступных палажэннях:

- наяўнасць устойлівага этноніма сведчыць пра сталую ідэнтычнасць этнасу, а змены ў этнаніміі народу – пра змены ў яго этнічнай самасвядомасці;
- назва мовы, на якой размаўляе этнас, роўна як і этнонім, вельмі значная для этнічнай ідэнтычнасці, прычым наяўнасць устойлівага лінгвоніма і яго станаўленне для яе важней, чым змена ўласна моўных характарыстык.

1. Гісторыка-геаграфічны кантэкст

У VII-VIII стст. усходнія славяне займалі шырокую прастору на ўсходзе Еўропы паміж Чорным і Балтыйскім марамі. Як вядома, геаграфія рассялення ўсходнеславянскіх плямёнаў апісана ў *Аповесці мінулых гадоў*:

> Таксама і гэтыя славяны прыйшлі і селі па Дняпры і назваліся паляны, а другія драўляны, бо сядзелі ў лясах, а другія селі паміж Прыпяццю і Дзвіною і назваліся дрыгавічамі, і яшчэ селі па Дзвіне і назваліся палачанамі, ад рэчкі, якая ўпадае ў Дзвіну, па імені Палата – ад яе і назваліся. Тыя ж славяны селі каля возера Ільменя, яны назваліся сваім імем і пабудавалі горад, і назвалі яго Ноўгарад. А другія селі па Дзясне і па Сейму, па Суле і назваліся севяране. І так разышоўся славянскі народ, а ад яго імя і грамата назвалася славянская (Povest′ vremennyh let, 2012, s. 11. Пераклад з рускай мовы Уладзіміра Кароткага і Жанны Некрашэвіч-Кароткай – http://philology.bsu.by).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Калі кароткa абагульніць геаграфічныя звесткі па праблеме, то Старажытная Русь утварылася ў IX ст. першапачаткова са сталіцай у Ноўгарадзе, пасля ў Кіеве і была самай ранняй і самай буйной дзяржавай усходніх славян. У XII ст. вялізная дзяржава стала распадацца на ўдзельныя княствы. У той жа час на палітычнай карце Ўсходняй Славіі з'явілася Вялікае Княства Літоўскае. Яно ўзнікла на тэрыторыі сучаснага беларускага Панямоння (т.зв. гістарычная Літва). У 30–40-х гг. XIII ст. Наваградскае (Наваградак – сучасны беларускі горад Навагрудак) княства з першым князем Міндоўгам стала хутка расці, далучаючы землі навакольных балцкіх і славянскіх княстваў. Паводле Аляксандра Краўцэвіча, назва *Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае* адлюстроўвае тры асноўныя тэрытарыяльныя складнікі дзяржавы, а чарговасць іх пералічэння – храналагічны парадак далучэння *Літвы* (складалася з зямель, якім сёння адпавядаюць Наваградчына, Гродзеншчына, Віленшчына і заходняй часткі Міншчыны), *Русі* (г.зн. Падняпроўя, Палесся) у XIII–XIV стст., *Жамойці* – у XV ст. Пад вызначэнне *Рускае* падпадалі таксама ўкраінскія землі, далучаныя ў XIV ст. (Kraŭcèvìč, 2013, s. 7).

Да XIV ст. Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) стала самай вялікай усходнеславянскай дзяржавай. Хуткай кансалідацыі славянскіх земляў вакол Наваградка спрыяла пагроза нашэсця рыцарскіх ордэнаў і орд Батыя. Княжая ўлада і развіццё дзяржавы ў Вялікім Княстве Літоўскім рэалізоўваліся тымі ж шляхамі, што і ў Маскоўскай Русі: інтрыгі, унутрысямейныя звады, забойствы, міжусобныя войны, саюзы. Пра гэта гаворыцца ў адной з першых згадак пра літоўскіх князёў у *Галіцка-Валынскім летапісы*:

> Въ лѣто 6723. Божиимъ повелениемь прислаша князи Литовьскии к великой княгини Романовѣ и Данилови и Василкови, миръ дающе. Быху же имена литовьскихъ князей се: старѣшей Живинъбудъ, Давъятъ, Довъспрункъ, братъ его Мидогъ, братъ Довъяловъ Виликаилъ. А жемотьскыи князи: Ерьдивилъ, Выкынтъ, а Рушьковичевъ – Кинтибуть, Вонибут, Бутовить, Вижѣикъ, и сынъ его Вишлий, Китений. Пликосова, а се Булевичи – Вишимут, егоже уби Миндого тъ, и жену его поялъ, и братью его побилъ, Едивила, Спрудѣйка, А се князи из Дяволтвы: Юдьки, Пукѣикъ, Бикши, Ликиикъ. Си же вси миръ даша князю Данилови и Василку, и бѣ земля покойна. Ляхом же не престающимъ пакостящимъ, и приведе на ня литву, и воеваша ляхы, и много убиства створиша в нихъ (Galicko-Volynskaâ letopis′, 1215).

Як адзначалася вышэй, Маскоўская (Вялікая) Русь і Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае развіваліся падобным чынам: абедзве дзяржавы ставілі перад сабой задачу збірання рускіх земляў. Аднак падобнасць лёсаў не азначала іх тоеснасць – былі і адрозненні, напрыклад, ВКЛ мела большую празаходнюю арыентацыю. Пры гэтым у самым Вялікім Княстве Літоўскім розныя этнасы і розныя гістарычныя вобласці моцна адрозніваліся. Не закранаючы шырокую і складаную праблему этнічнага складу ВКЛ, спынімся на продках беларусаў

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

і ўкраінцаў. Калі практычна ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі адносілася да Вялікага Княства Літоўскага, то з украінскімі тэрыторыямі было інакш. Пасля распаду Кіеўскай Русі на ўдзельныя княствы (882–1240) і спусташэнні Кіева Батыем (1240 г.) статус палітычнага і культурнага цэнтра перайшоў ад Кіеўскага княства да Галіцка-Валынскага (1199–1392). У выніку працяглай, 52-гадовай вайны, землі Галіцка-Валынскага княства былі падзелены паміж яго суседзямі – Польшчай і ВКЛ. Віталь Русаніўскі піша:

> У канцы XIV ст. ўкраінскія землі ўваходзілі ў склад некалькіх дзяржаў. Большая частка тэрыторыі Украіны, а менавіта: Кіеўшчына і Пераяслаўшчына, Чарнігаўшчына, Валынь і паўночна-ўсходняе Падолле – уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Галіцыя і паўднёва-заходняе Падолле былі захопленыя Польшчай, частка падольскіх і галіцкіх земляў (Букавіна) адышлі да Малдаўскага княства, Закарпацце было пад уладай венгерскіх каралёў (Rusanivs′kij, 2001, s. 47, пераклад наш – А. Р.).

З гэтай прычыны беларусы цалкам ідэнтыфікуюць сваю гісторыю з Вялікім Княствам Літоўскім, а ўкраінцы – толькі ў малой частцы. Аб адносінах і стасунках (палітычных, культурных, моўных) паміж заходнімі землямі ВКЛ, дзе знаходзілася вялікакняская канцылярыя, і паўднёва-ўсходнімі (Кіеўшчына, Валынь), дзе былі моцныя культурныя і сацыяльныя традыцыі Кіеўскай Русі, неаднаразова пісалася, гл., напрыклад, манаграфію Дзмітрыя Вашчука (Vaŝuk, 2009) або артыкул Андрыя Даніленкі (Danylenko, 2017).

Землі на тэрыторыі сучаснай Беларусі былі поліэтнічнымі і шматканфесійнымі. Апроч традыцыйнага праваслаўя, тут былі шырока распаўсюджаныя каталіцтва, пратэстантызм і іншыя, нехрысціянскія, канфесіі. Агульнавядомая беларуская талерантнасць карэніцца менавіта ў мультыэтнічнасці і мультыканфесійнасці ВКЛ. XVI ст. лічыцца апагеем культурнага і палітычнага росквіту Вялікага Княства Літоўскага, аднак пастаянныя войны з Маскоўскім княствам прывялі да Люблінскай уніі 1569 г. Пералічым толькі самыя буйныя сутыкненні: Паходы Альгерда на Маскву 1368–1372, Руска-літоўская вайна 1500–1503, Руска-літоўская вайна 1507–1508, Руска-літоўская (Дзесяцігадовая) вайна 1512–1522, Руска-літоўская (Старадубская) вайна 1534–1537, сутыкненні падчас Лівонскай вайны (1561–1570).

Руска-польскія войны ў XVII–XVIII стст. успыхвалі пастаянна: Руска-польская вайна 1605–1618, Смаленская вайна 1631–1634, Руска-польская вайна 1654–1667, Вайна за польскую спадчыну 1733–1735, Барская канфедэрацыя 1768–1776, Руска-польская вайна 1792. Тэрыторыя сучаснай Беларусі была на скрыжаванні ваенных падзей, і таму асабліва цярпела. Аднак менавіта ў гэты час распаўсюджваюцца пісьмовыя згадкі этноніма *беларус* і адпаведных назваў сучасных беларускіх земляў.

Далей звернемся да станаўлення этноніма *беларус*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

2. Станаўленне этнаніміі беларусаў

Спынімся на назвах *Белая Русь, беларус, беларускі*. Існуе вялікая літаратура пра назву *Белая Русь* – успомнім толькі кнігу Алеся Белага *Хроніка „Белай Русі”. Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы* (Мінск, 2000). У кнізе прыведзена храналагічная табліца ўжывання назвы *Белая Русь* (Bely, 2000, s. 190–191). З дадзенай табліцы і работ іншых аўтараў вынікае, што назва *Белая Русь* адносілася да розных тэрыторый: Наўгародскай зямлі, Маскоўскага царства.

Напрыклад, Самуіл Грондскі, польскі гісторык паўстання Хмяльніцкага, каля 1660 г. пісаў:

> … ad Albam Ruſſiam (cujus pars attingit Boriſthenem, pars autem extendit ſe ſe ſerme ad Moſcoviam) & ad *Poleſie*, quod ab Alba Ruſſia procedendo, attingit *Wolhiniam*, & altera parte usque ipſam Lithvaniam vocantur *Ukrainſcii*: ſic dicti ideo, quod degant in iis Provinciis, quæ ſunt ſitæ, quaſi ad marginem Regni Poloniæ, reſpectu aliorum regnorum, utpote Valahiæ, quam dislimitat *Tyras*, & camporum deſertorum verſus ditiones Tataricas. Margo enim Polonice Kray: inde *Ukraina*, quaſi Provincia ad fines Regni poſita… (Grondski 1789, 19). – [тыя, хто засяляюць землі] …да Алба Русіі / Белай Русі (якой частка мяжуе з Барысфенемам, а частка распасціраецца да Масковіі) і да Палесся (што зыходзіць ад Белай Русі і даходзіць да Валыні), а з другога боку да самой Літвы, называюцца ўкраінцы: яны так называюцца, таму што жывуць у тых правінцыях, якія размешчаны на ўскраіне Каралеўства Польскага ў адносінах да іншых царствам, такім як Валахія, якая аддзяляе Цірас, і татарскім уладанням на пустынных раўнінах. Margo па-польску ёсць край: адсюль Украіна, гэта значыць правінцыя, якая знаходзіцца на ўскраіне каралеўства (Grondski de Grondi, 1789, пераклад наш – A.P.).

Толькі ў другой палове XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй *Хроніцы* ужывае назву *Bielorussacy Litewcy*, а ў 1627 г. Белая Русь згадваецца як частка Рэчы Паспалітай. Лешак Бэднарчук адзначае:

> W średniowieczu nazwa *Biała Ruś / Bełaja Ruś / Alba Russia* odnosiła się do różnych części Rusi północnej (Łatyszonek 2006), a w czasach WKL do jego północno-wschodniej części (Połock, Witebsk, Mohylew, Mścisław) w przeciwieństwie do znajdującej się na południu *Czarnej Rusi* (Nowogródek, Pińsk, Owrucz). W XIX wieku nazwa została rozszerzona na całą Ruś Litewską, a kształtujący się na tym terytorium naród białoruski przyjął samookreślenie *B'ełaruś* (kraj), *B'elarus* (mieszkaniec). Nazwa ta jednak nie występuje w funkcji nazwiska (od)etnicznego, bowiem w czasach WKL mieszkańców Białorusi nazywano *Litwinami* lub *Rusinami*. Ze względu na różnoetniczną konotację tych określeń nie zawsze jesteśmy w stanie określić, czy w danym przypadku chodzi o Białorusina, Ukraińca czy też etnicznego Litwina. (Bednarczuk, 2010, s. 135).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Калі гаварыць пра славянскія этнасы і этнонімы Вялікага Княства Літоўскага, то ў ВКЛ ужываліся намінацыі лакальна-мясцовай ідэнтычнасці тыпу *мазыране, палачане*, агульны для ўсіх жыхароў краіны палітонім *ліцвін* і этнонім *русін*, распаўсюджаны сярод праваслаўнага насельніцтва мясцовасцей, якія раней уваходзілі ў склад Кіеўскай Русі. „У ВКЛ, думаю, можна было адначасова быць і ‘ліцвінам’, і ‘русінам’ – гэта не выклікала канфлікту ў свядомасці таго часу”, – піша Генадзь Сагановіч (Saganovìč, 2003, s. 294). Лешак Бэднарчук называе для славян – жыхароў ВКЛ – такія этнонімы, як *(бела)русін, лях, паляк, падлясяк, паляшук, літвін* (Bednarczuk, 2010, s. 135–143).

Падсумуем асноўныя ідэі навукоўцаў, як згаданых вышэй, так і іншых (Bèdnarčuk, 2014; Galenčanka, 2003; Dzârnovič, 2017 і інш.), аб станаўленні беларускіх этнонімаў:

- мясцовыя самаідэнтыфікацыі ледзь не цалкам выцясняюць агульнаэтнічныя (па дадзеных пісьмовых помнікаў);
- магчымы множныя самаідэнтыфікацыі жыхароў усходніх земляў ВКЛ;
- *літвін* – палітонім, як „жыхар Вялікага Княства Літоўскага”;
- *Русь, русін* – найбольш частая ідэнтыфікацыя ў дакументах асноўнага насельніцтва Беларусі і Украіны, г.зн. „рускіх” земляў ВКЛ і – пазней – Рэчы Паспалітай;
- адзіны этнонім цвёрда не склаўся яшчэ і таму, што не было канфесійнага адзінства гэтых земляў; назва ўсходніх земляў ВКЛ *Русь* падкрэслівала праваслаўны характар, тым не менш яна ўспрымалася як „іншая Русь”. Некаторыя сённяшнія даследнікі адрозніваюць *Вялікую Русь* і *русь ВКЛ* (апошняя часта пішацца з маленькай літары) (гл. Dzârnovič, 2009, s. 234–249; Doronin, 2020; Florâ, 1997).
- назвы *беларус, беларусец* пачынаюць ужывацца ў дачыненні да ўсходніх славян ВКЛ у другой палове XVI ст., *Белая Русь* у дачыненні да ўсходніх земляў Рэчы Паспалітай – з XVII ст.; да канца XIX ст. яны ўжываюцца спарадычна, але ўсё часцей.

З першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. да 1796 г. у складзе Расіі існавала Беларускае генерал-губернатарства – Магілёўская і Віцебская губерні. У астатняй частцы Рэчы Паспалітай былі ўтвораны Літоўскі і Беларускі дэпартаменты. У 1796 г. Беларуская губерня аб’яднала Віцебскую і Магілёўскую. Назва *Беларусь* у дачыненні да ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі і этнонім *беларус* канчаткова замацоўваюцца да 1890-х гг.

Улады Расійскай імперыі падтрымлівалі назвы *Белая Русь, Белоруссия, белорус*, паколькі гэта садзейнічала ўмацаванню ідэі адзінай Вялікай Расіі і адзінага рускага народа ў трох выявах: вялікаросы, маларосы і беларосы / беларусы, а таксама і адзінай рускай мовы з маларускай і беларускай гаворкай у яе ўлонні. Заснавальнік даследаванняў беларусаў і беларускай мовы, аўтар трохтомнай працы *Белорусы* Яўхім Карскі паслядоўна выкарыстоўваў тапонім *Белоруссия* і этнонім *белорус(с)ы* (Karskij, 1903, I).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Этнатапонім *Беларусь* ужываўся толькі ў беларускай мове; яго вядомае найбольш ранняе ўжыванне – у складзе слогана паўстанцаў Кастуся Каліноўскага (1863–1964): „Каго любіш? – Беларусь. – То ўзаемна". Як вядома, дадзены этнатапонім быў замацаваны заканадаўча як афіцыйная назва краіны – *Рэспубліка Беларусь / Беларусь* – у 1992 г. Змена афіцыйнага этнатапоніму (*Беларуская ССР, Белоруссия → Беларусь*) у дадзеным выпадку суправаджае сур'ёзныя сацыяльныя змены і рост нацыянальнай самасвядомасці, у сваю чаргу стымулюючы яго.

Відавочна, што этнонім *беларус* часта аналізуецца ў працах гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, напрыклад Алега Латышонка (Latyšonak, 2009), Юліі Чарняўскай (Černâvskaâ, 2010) і мн. інш. Аб станаўленні лінгвоніма гаворка пойдзе ніжэй.

4. Станаўленне лінгванімii беларусаў

Паслядоўны разгляд назваў мовы, на якой размаўлялі продкі беларусаў, мае на ўвазе выклад, хаця б вельмі сціслы, гісторыі самой мовы.

Кантынуум усходнеславянскіх дыялектаў VI–VII стст., які прынята называць агульнаўсходнеславянскай мовай, быў менавіта сукупнасцю роднасных дыялектаў, а не адзінай мовай. У XI–XII стст. усходнеславянскі моўны кантынуум „дзяліўся на дыялектныя зоны: паўднёва-заходняя (кіеўскія і галіцка-валынскія гаворкі), заходняя (смаленскія і полацкія гаворкі), паўднёва-ўсходняя (разанскія і чарнігаўскія гаворкі), паўночна-заходняя (наўгародскія і пскоўскія гаворкі), паўночна-усходняя (растова-суздальскія гаворкі)" (RGES, 2002). Беларуская і ўкраінская мовы пасля фармаваліся на аснове паўднёва-заходняй, заходняй і збольшага паўднёва-ўсходняй дыялектных зон. На пісьме адрозніваліся тры варыянты агульнаўсходнеславянскай мовы, якія звычайна называюць: наўгародская, стараруская і заходнерускаяе. Пісьмовы варыянт агульнаўсходнеславянскай мовы, які прынята называць заходнерускай, тэрытарыяльна супадае з межамі Вялікага Княства Літоўскага. Вышэй ужо гаварылася пра тое, што Вялікае Княства Літоўскае было мультыэтнічным, мультыканфесійным і мультымоўным. Не пералічваючы ўсе мовы ВКЛ, спашлемся толькі на вядомую працу Вячаслава Іванава *Славянскія дыялекты ў суадносінах з іншымі мовамі ВКЛ* (Ivanov, 2003). Славянскія мовы Вялікага Княства Літоўскага – гэта руская, або рутэнская („простая мова") з беларускім і ўкраінскім варыянтамі, а таксама царкоўнаславянская і польская мовы. Пісьмова-літаратурнай і афіцыйнай мовай у ВКЛ XIV–XVII стст. была мова, якая ў той час называлася рускай або „простай" мовай, а пасля – па-рознаму: старабеларуская, стараўкраінская, заходнерускаяе (літаратурна-)пісьмовая мова, рутэнская мова, паўднёваруская мова, руская, русінская, славянская мова Вялікага Княства Літоўскага, канцылярская мова Вялікага Княства Літоўскага і інш. Гэта была змешаная кніжная мова, якая развілася з мясцовага варыянта

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

агульнаўсходнеславянскай мовы і ў якую пранікалі дыялектныя рысы, у першую чаргу раннебеларускія і раннеўкраінскія, і далей з больш дробным дыялектным падзелам. Уплыў жа царкоўнаславянскай на яе быў адносна слабым (у параўнанні са старарускім). У адрозненне ад гутарковай беларускай, гэтая пісьмовая мова доўгі час была адносна адзінай для ўсіх заходнерускіх земляў. З цягам часу мясцовых элементаў у „простай мове" (у пісьмовай мове Вялікага Княства Літоўскага) станавілася ўсё больш. Пра моўную сітуацыю ў ВКЛ і яго мовах шмат напісана, адна з адносна нядаўніх прац пра назвы афіцыйна-пісьмовай мовы Княства – гэта артыкул Андрыя Даніленкі (Danylenko, 2006).

Такім чынам, у межах Вялікага Княства Літоўскага з самых ранніх перыядаў яго існавання вылучаліся ўкраінскія і беларускія дыялекты ў жывой гутарковай мове і старабеларускі і стараўкраінскі варыянты ў афіцыйна-пісьмовай мове ВКЛ – „простай мове". Адрозненні паміж гэтымі варыянтамі абагульнены ў артыкуле Уладзіміра Свяжынскага *Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага* (Svâžynskì, 2003). Аўтар падсумоўвае ўсе адметныя беларуска-ўкраінскія моўныя рысы і заключае:

> …розныя ўмовы і вынікі фарміравання беларускай і ўкраінскай моў дазваляюць сцвярджаць, што пад вонкава падобнымі графіка-арфаграфічнымі абалонкамі і пад адной з агульных назваў „руская" ў Вялікім Княстве Літоўскім існавалі, у тым ліку і ў якасці афіцыйных, дзве ўсходнеславянскія мовы – беларуская і ўкраінская (Svâžynskì, 2003, 13).

На іх аснове пазней фармаваліся нацыянальныя ўкраінская і беларуская мовы.

У слоўніку Памвы Бярынды (*Лексикон славенороссский и имен толкование*, 1627 г.) „русская речь" (г.зн. „проста мова") супрацьпастаўляецца „валынскай" (г.зн. украінскай) і „літоўскай" (г.зн. беларускай): „церковнослав. *пѣтель*: чески, руски, *когутъ*, волынски, *пѣвенъ*, литовски, *петухъ*" (Berynda, 1627, s. 104)[1].

„Такім чынам, „простая мова" супрацьпастаўляецца як царкоўнаславянскай мове, так і дыялектнай украінскай ці беларускай гаворцы" (Uspenskij, 1994, s. 68). Барыс Успенскі канстатуе, што сучаснікі – жыхары ВКЛ – адрознівалі чатыры названыя мовы, аднак гэта адрозненне не было паслядоўным. У прыватнасці, назва *русский (руський) язык* у часы росквіту ВКЛ ужывалася недыферэнцыравана. За ёй стаялі тры розныя мовы: згаданая вышэй „простая мова", царкоўнаславянская і старараруская – папярэдніца сучаснай рускай мовы. У выпадку настойлівай неабходнасці адрозніваць іх сучаснікі звярталіся да дадатковых дэфініцый: літоўска-руская, кніжна-руская, маскоўска-руская.

[1] Прыклад узяты з кнігі Б. Успенскага Краткий очерк истории русского литературного языка (XI–XIX вв.) (Uspenskij, 1994, s. 67).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Пра тое, як называлі сваю мову продкі беларусаў, піша Сяргей Запрудскі (Zaprudskì, 2013) і выдзяляе наступныя этапы.

1) З XIV ст. і як энда-, і як экзалінгвонім ужывалася назва *руська мова*, і гэта назва захоўвалася да XVII ст. *Рускія, росы* – менавіта так называлася беларуска-ўкраінскае насельніцтва ВКЛ і пазней Рэчы Паспалітай у процівагу *маскве, маскавітам* і *маскоўскай мове*, пазней – *расійскай мове*.

2) З XVI ст. пачынае выкарыстоўвацца назва *літоўская мова* ў сувязі з ужываннем палітоніма *ліцвін*. Як вядома, само слова *мова* ‘мова’ ёсць толькі ў беларускай і ўкраінскай мовах і фіксуецца ў помніках пісьменства з XVI ст. У польскай мове гэтае слова мае іншае значэнне – ‘маўленне, гаворка’.

3) *Беларуская мова, белорусский язык* з’яўляецца як экзалінгвонім з XVII ст. і распаўсюджваецца ўслед за этнонімам *беларус(ец)*. „*Белорусский язык*, *беларуская мова* – так пісалі пра мову і беларускіх, і ўкраінскіх земляў з другой паловы XVII ст., беларускімі называліся кнігі, надрукаваныя на беларускіх і ўкраінскіх тэрыторыях” (Zaprudskì, 2013, s. 88–89), асабліва перакладныя. Многія кнігі, напрыклад *Secretum Secretorum* (*Арыстоцелевы вароты*) і астралагічныя тэксты *Віленскага зборніка*[2], проста не маглі быць перакладзены ў Маскоўскім царстве з прычыны яго рэлігійнай артадаксальнасці.

Кнігадрукаванне, першыя пераклады Бібліі (Францыск Скарына), усходнеславянскія слоўнікі і граматыкі ўсходніх славян упершыню з’явіліся ў Вялікім Княстве Літоўскім і актыўна выкарыстоўваліся ў абедзвюх дзяржавах. Граматыкай Мялеція Сматрыцкага (1618–1619) карыстаўся Міхаіл Ламаносаў. У другой палове XVII ст. Юры Крыжаніч называў першадрукароў, граматыстаў і аўтараў слоўнікаў (г. зн. Ф. Скарыну, П. Бярынду, М. Сматрыцкага і інш.) „беларусцамі” і згадваў беларускую мову ў *Граматично изказање об руском језику* (1666) (Zaprudskì, 2013, s. 102).

Згаданыя вышэй назвы беларускай мовы на працягу стагоддзяў маглі ўжывацца паралельна.

4) „У XIX ст. *белорусский язык* / *беларуская мова* магла называцца *беларускай, рускай* (а таксама складанымі лінгвонімамі з апорным кампанентам *рускі: заходнярускай, літоўска-рускай* і інш.), *русінскай, рутэнскай*, *літоўскай*, *крывіцкай* (і вытворнымі складанымі назвамі).

Сітуацыя, калі мова на нейкім этапе свайго развіцця мела 12 назваў, відаць, не зусім звычайная” (Zaprudskì, 2013, s. 84). Адсутнасць адзінага лінгвоніма выклікана ў выпадку беларускай мовы адсутнасцю ўстойлівага этноніма і лакальна-множнай этнічнай самаідэнтыфікацыяй на працягу стагоддзяў.

[2] Віленскі зборнік – арыгінал рукапіснага зборніка (і яго pdf-копія) канца XV – пачатку XVI стст. з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у якім сабраны перакладныя тэксты астралагічнай тэматыкі, а таксама Арыстоцелевы вароты, або Тайная тайных. У навуковым ужытку гэты рукапіс больш вядомы як Віленскі спіс Тайная тайных, які названы так па месцы папярэдняга захоўвання – у Віленскай публічнай бібліятэцы.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Замацаванню назвы *русский язык* за расійскім варыянтам і *белорусское наречие* – за заходнерускай, ці літоўскай, ці крывіцкай мовай спрыялі адміністрацыйныя намаганні ўладаў Расійскай імперыі, якія імкнуліся трактаваць назву *русский* як ‘вялікарускі’, а *белорусский*, *малорусский* – як дыялекты адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак: такія назвы аблягчалі трактоўку гэтых ідыёмаў як дыялектаў, разнавіднасцей адной мовы – рускай, а не як самастойныя мовы.

Назва *белорусский язык, беларуская мова* замацоўваецца да 1890-х гг., г.зн. да канца XIX ст. У перапісе 1897 г. прапаноўвалася менавіта гэта назва, і 5,58 млн. жыхароў Беларусі назвалі беларускую мову роднай.

Як трактаваўся гэты ідыём: як мова ці як дыялект?

XIX і пачатак XX ст. рэпрэзентуюць тры пункты гледжання на характар беларускай мовы:

а) афіцыйны пункт гледжання ўладаў Расійскай імперыі: беларускі і маларускі, г. зн. украінскі, ідыёмы – гэта дыялекты рускай мовы;

б) пункт гледжання паэтаў і рэвалюцыйных рамантыкаў: беларуская мова – паўнавартасная самастойная мова, яе трэба развіваць і абараняць;

в) пункт гледжання лінгвістаў – супярэчлівы і непаслядоўны. Паколькі яшчэ не быў прыняты сучасны сацыялінгвістычны прынцып адрознення мовы ад дыялекту – вядучая роля моўнай свядомасці большасці носьбітаў, то лінгвісты спрабавалі вызначыць гэты ідыём праз моўныя рысы, параўнанне з суседнімі мовамі, гісторыю і інш. Доўгая бясплодная дыскусія XIX–XX стст. і розныя пункты гледжання на праблему апісаны С. Запрудскім (Zaprudskì, 2013), ды і самі паняцці „мова” і „гаворка, дыялект” мелі іншае (далёка не заўсёды строга тэрміналагічнае) напаўненне. Ідыём, на якім гаварыла насельніцтва Беларусі XIX – пачатку XX стст., у асноўным трактавалі як *наречие*, г. зн. як дыялект. Напрыклад, Яўхім Карскі, аўтар 3-томнай працы *Беларусы* пісаў, што беларусаў 8,5 млн., але паслядоўна называў беларускую мову „наречием” (гл., напрыклад, Karskij, 1903, III).

Беларуская мова была афіцыйна зацверджана як мова – адна з чатырох моў БНР – канстытуцыяй Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г.

Заключэнне

У артыкуле, прысвечаным лінгванміі, Аляксандр Дулічэнка піша пра тое, што этнонім, як правіла, з’яўляецца адтапонімным утварэннем, г.зн. назва народу часта (і ў выпадку з беларусамі таксама – А.Р.) з’яўляецца пасля развіцця этнатапоніма, а лінгвонім развіваецца на базе этноніма (Duličenko, 2020, s. 13–14). Да пачатку XX ст. для беларусаў склалася цалкам устойлівая сістэма „этнатапонім – этнонім – лінгвонім”. Калі сыходзіць з тэзісу ва ўводзінах пра тое, што устойлівыя назвы мясцовасці, этнасу і мовы сведчаць пра сталую

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

этнаідэнтычнасць, то беларусы ўжо на працягу стагоддзя ўсведамляюць сябе адзіным народам. Этнонімы і лінгвонімы беларусаў усталяваліся да пачатку XX ст. – з гэтай прычыны наша даследаванне мы абмежавалі менавіта гэтым часам.

У дадзеным артыкуле этнонімы і лінгвонімы беларусаў разглядаліся ў дыяхранічным аспекце, які прыдатны і да даследавання этнаідэнтычнасці. Ідэнтычнасць народа канстытуюецца, сярод іншага, гістарычнай памяццю. Як стаўленне да мовы/моў рэгулюецца моўнай палітыкай, так і гістарычная памяць можа мадэлявацца з дапамогай палітыкі ідэалагічнай – у дачыненні да ўсходніх славян і актуальных падзей іх сацыяльнай гісторыі пра гэта пішуць, напрыклад, аўтары калектыўнай манаграфіі *Вайна і памяць у Расіі, Украіне і Беларусі*. (Fedor i in., 2017). Ролю гістарычнай памяці ў фарміраванні этнаідэнтычнасці беларусаў аналізуюць Максім Руст (Rust, 2018), Сімон Льюіс (Lewis, 2019), Пер Андэрс Рудлінг (Rudling, 2017) і інш.

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. беларуская мова перажыла нямала калізій, тое ж можна сказаць і аб працэсе станаўлення этнічнай ідэнтычнасці – пра гэта шмат пісалі, гл., напрыклад, кнігу Ніны Мячкоўскай *Беларуская мова: Сацыялінгвістычныя нарысы*, дзе, у прыватнасці, параўноўваецца нацыянальнае адраджэнне ў Беларусі і Украіне (Mečkovskaâ, 2003, s. 63–92), а таксама Іны Каліты (Kalita, 2010) і мн. інш. Беларуская і ўкраінская мовы пасля перабудовы сталі развівацца рознымі шляхамі: украінская як адзіная дзяржаўная мова краіны карыстаецца прыярытэтнай падтрымкай; для Беларусі быў абраны шлях дзяржаўнага двухмоўя (разам з рускай мовай), што яшчэ больш аслабіла пазіцыі беларускай мовы. З канца XX ст. этнаідэнтычнасць беларусаў і ўкраінцаў таксама развівалася па-рознаму, як і стаўленне соцыуму да нацыянальнай мовы. Але, як было адзначана ва ўводзінах, развіццё ідэнтычнасці народа і яго мовы – гэта тэмы, якія павінны разглядацца асобна.

REFERENCES

Bednarczuk, Leszek. (2010). *Językowy obraz Wielkiego Księstwa Litewskiego*. Kraków: Wydawnictwo Lexis.

Bèdnarčuk, Lešèk (2014). *Spadčyna Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga ŭ belaruskaj move.* N′û Ërk–Krakaŭ–Lûblìn: Belaruskì Ìnstytut Navukì ì Mastactva, Pol′skaâ Akadèmìâ Mastactva, Unìversìtèt Maryì Kûry-Skladoŭskaj. [Бэднарчук, Лешэк. (2014). *Спадчына Вялікага Княства Літоўскага ў беларускай мове*. Нью Ёрк–Кракаў–Люблін: Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва, Польская Акадэмія Мастацтва, Універсітэт Марыі Кюры-Складоўскай].

Bely, Ales′. (2000). *Hronika „Belaj Rusì”. Narys gìstoryì adnoj geagrafičnaj nazvy.* Mìnsk: Èncyklapedyks. [Белы, Алесь. (2000). *Хроніка „Белай Русі”. Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы*. Мінск: Энцыклапедыкс].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Berynda, Pamva. (1627). *Leksìkonъ slavenorωsskïj al'bo Imenъ tlъkovanïê.* Kiev: Tipografiâ Kievo-Pečerskoj Lavry. [Берында, Памва. (1627). *Лексіконъ славенорωсскїй альбо Именъ тлъкованїє*. Киев: Типография Киево-Печерской Лавры].

Černâvskaâ, Ûliâ. (2010). *Belorusy. Ot „tutèjšyh" k nacii*. Minsk: FUAinform. [Чернявская, Юлия. (2010). *Белорусы. От «тутэйшых» к нации*. Минск: ФУАинформ].

Danylenko, Andrij. (2006). On the Name(s) of the Prostaja Mova in the Polish–Lithuanian Commonwealth. *Studia Slavica Hung.*, 51(1–2), pp. 97–121.

Danylenko, Andrij. (2017). A Missing Chain: On the Sociolinguistics of the Grand Duchy of Lithuania. *Acta Baltico-Slavica*, 41, p. 31–57.

Duličenko, Aleksandr. (2020). *Lingvonimika. Učenye zapiski Petrozavodskogo gosudarstvennogo universiteta*, 42(7), s. 13–16. DOI: 10.15393/uchz.art.2020.533. [Дуличенко, Александр. (2020). *Лингвонимика. Ученые записки Петрозаводского государственного университета*, 42(7), с. 13–16].

Dzârnovič, Oleg. (2017). „Rus'" i „Litva" Velikogo Knâžestva Litovskogo v XVI–XVII vv. kak ètnokonfessional'nye i social'no-geografičeskie regiony. W: *Drevnââ Rus' posle Drevneĭ Rusi: diskurs vostočnoslavânskogo (ne)edinstva* (s. 118–132). Moskva: ROSSPÈN. [Дзярнович, Олег. (2017). „Русь" и „Литва" Великого Княжества Литовского в XVI–XVII вв. как этноконфессиональные и социально-географические регионы. В: *Древняя Русь после Древней Руси: дискурс восточнославянского (не)единства* (с. 118–132). Москва: РОССПЭН.].

Dzârnovič, Oleg. (2009). „Litva" i „Rus'" XIII–XVI vv. kak koncepty belorusskoj istoriografii. *Miscellanea*, 1/2(5/6), s. 234–249. [Дзярнович, Олег. (2009). „Литва" и „Русь" XIII–XVI вв. как концепты белорусской историографии. *Miscellanea*, 1/2(5/6), с. 234–249].

Doronin, Andrej (red). (2020*). Religiâ i rus' XV–XVIII vv.* Moskva: Polit. ènciklopediâ. [Доронин, Андрей (ред). (2020). *Религия и русь XV–XVIII вв.* Москва: Полит. Энциклопедия].

Florâ, Boris. (1997). O nekotoryh osobennostâh razvitiâ ètničeskogo samosoznaniâ vostočnyh slavân v èpohu srednevekov'â – rannego novogo vremeni. W: Aleksej Miller, Vladimir Reprincev, Borys Florâ (red.). *Rossiâ – Ukraina: istoriâ vzaimootnošenij* (s. 9–28). Škola „Âzyki russkoj kul'tury". [Флоря, Борис. (1997). О некоторых особенностях развития этнического самосознания восточных славян в эпоху средневековья – раннего нового времени. В: Алексей Миллер, Владимир Репринцев, Борис Флоря (ред.). *Россия – Украина: история взаимоотношений* (s. 9–28). Школа „Языки русской культуры"]. Pobrano z: http://litopys.org.ua/vzaimo/vz02.htm (dostęp: 18.07.2023)].

Fedor, Julie; Kangaspuro, Markku; Lassila, Jussi; Zhurzhenko, Tatiana (eds.). (2017). *War and Memory in Russia, Ukraine and Belarus*. Cham, Switzerland: Palgrave Macmillan. Pobrano z: https://link.springer.com/content/pdf/10.1007/978-3-319-66523-8.pdf (dostęp 11.04.2023).

Galicko-Volynskaâ letopis'. Podgotovka teksta, perevod i kommentarii: Ol'ga P. Lihačeva. W: *Èlektronnye publikacii Instituta russkoj literatury (Puškinskogo doma) RAN*. [Галицко-Волынская летопись. Подготовка текста, перевод и комментарии: Ольга П. Лихачева. В: *Электронные публикации Института русской литературы* (Пушкинского

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

дома) РАН]. Pobrano z: http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4961 (dostęp: 17.06.2023).

Grondski de Grondi, Samvele. (1789). *Historia Belli Cosacco-Polonici*. Budapeszt: Litteris František August Patzko. Biblioteka Jagiellońska, Berol. Uf 9654. Digital copy identifier: NDIGSTDR010394. Pobrano z: https://jbc.bj.uj.edu.pl/dlibra/doccontent?id=2761660 (dostęp 09.08.2023).

Galenčanka, Georgij. (2008). Da pytannâ ab ètnìčnyh ì ètnakanfesìĭnyh katègoryâh Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga XIV–XVI stst.: „belaruscy", „lìcvìny" ì „rusìny" ŭ dyskursah sučasnyh dasledčykaŭ ì pìs′movyh krynìcah, W: *Studia Historica Europae Orientalis. Issledovaniâ po istorii Vostočnoĭ Evropy*, 1 (s. 9–19). Minsk: BSU. [Галенчанка, Георгій. (2008). Да пытання аб этнічных і этнаканфесійных катэгорыях Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVI стст.: „беларусцы", „ліцвіны" і „русіны" ў дыскурсах сучасных даследчыкаў і пісьмовых крыніцах, В: *Studia Historica Europae Orientalis. Исследования по истории Восточной Европы*, 1 (с. 9–19). Минск: БГУ.].

Ivanov, Vâčeslav Vs. (2003). Slavânskie dialekty v sootnošenii s drugimi âzykami VKL. W: *Slavânskoe âzykoznanie. XIII Meždunarodnyj s"ezd slavistov. Lûblâna. Doklady rossijskoj delegacii* (s. 258–288). Moskva: Indrik. [Иванов, Вячеслав Вс. (2003). *Славянские диалекты в соотношении с другими языками ВКЛ. В: Славянское языкознание. XIII Международный съезд славистов. Любляна. Доклады российской делегации* (с. 258–288). Москва: Индрик].

Kalita, Inna. (2010). *Sovremennaâ Belarus': âzyki i nacional'naâ identičnost'*. Ústí nad Labem: PF UJEP. [Калита, Инна. (2010). *Современная Беларусь: языки и национальная идентичность*. Ústí nad Labem: PF UJEP].

Karskij, Efimij. (1903). *Belorussy*. T. I: *Vvedenie v izučenie âzyka i narodnoj slovesnosti*. Varšava: Tipografiâ Varšavskago Učebnago Okruga. [Карский, Ефимий. (1903). *Белоруссы*. Т. I: *Введение в изучение языка и народной словесности*. Варшава: Типографія Варшавскаго Учебнаго Округа].

Kraŭcèvìč, Alâksandr. (2013). *Gìstoryâ Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga*. Garodnâ: Garadzenskaâ bìblìâtèka. [Краўцэвіч, Аляксандр (2013). *Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага*. Гародня: Гарадзенская бібліятэка].

Latyšonak, Aleg. (2009). *Nacyânal'nasc' – Belarus*. Vìl′nûs: Ìnstytut belarusìstykì. [Латышонак, Алег (2009). *Нацыянальнасць – Беларус*. Вільнюс: Інстытут беларусістыкі].

Łatyszonek, Oleg. (2006). *Od Rusinów Białych do Białorusinów*. Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku.

Lewis, Simon. (2019). *Belarus – Alternative Visions: Nation, Memory and Cosmopolitanism*. New York & London: Routledge.

Mečkovskaâ, Nina. (2003). *Belorusskij âzyk: Sociolingvističeskie očerki*, Specimina philologiae slavicae. 138. München: Verlag Otto Sagner. [Мечковская, Нина. (2003). *Белорусский язык: Социолингвистические очерки*, Specimina philologiae slavicae. 138. München: Verlag Otto Sagner.

Plokhy, Serhiy. (2006). *The Origins of the Slavic Nations: Premodern Identities in Russia, Ukraine, and Belarus*. Cambridge: Cambridge University Press.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Povest' vremennyh let. (2012). Perevod: Dmitrij Lihačev, Oleg Tvorogov. Sankt-Peterburg: Vita Nova. [*Повесть временных лет*. (2012). Перевод: Дмитрий Лихачев, Олег Творогов. Санкт-Петербург: Вита Нова].

RGES 2002: *Rossijskij gumanitarnyj èntsiklopedičeskij slovar'*. (2002). T. I: *Drevnerusskij âzyk*. Moskva: Vlados, Filologičeskij fakul'tet SPbGU. [РГЭС 2002: *Российский гуманитарный энциклопедический словарь*. (2002). Т. I: *Древнерусский язык*. Москва: Владос, Филологический факультет СпбГУ]. Pobrano z: https://slovari.yandex.ru/~книги/Гуманитарный%20словарь/Древнерусский%20язык (dostęp: 21.05.2023).

Rossijskaâ grammatika Mihajla Lomonosova. (1788). 5-e tisnenïe. Sankt-Peterburgъ: Imperatorskaâ Akademïâ naukъ. [*Россійская грамматика Михайла Ломоносова* (1788). 5-е тисненїе. Санкт-Петербургъ: Императорская Академїя наукъ].

Rudling, Per. (2017). „Unhappy Is the Person Who Has No Motherland": National Ideology and History Writing in Lukashenka's Belarus, In: Fedor, Julie et al. (eds.) *War and Memory in Russia, Ukraine, and Belarus*. Chapter 3. *Cham*, Switzerland: Palgrave Macmillan. 71–105. DOI 10.1007/978-3-319-66523-8_3. Pobrano z: https://www.academia.edu/35653615/_Unhappy_Is_the_Person_Who_Has_No_Motherland_National_Ideology_and_History_Writing_in_Lukashenkas_Belarus_in_J_Fedor_et_al_eds_War_and_Memory_in_Russia_Ukraine_and_Belarus_Cham_Switzerland_Palgrave_Macmillan_2017_71_105?email_work_card=title (dostęp: 11.05.2023).

Rusanivs'kij, Vitalij. (2001). *Ìstorìâ ukraïns'koï lìteraturnoï movi*. Kiïv: Artek. URL: http://litopys.org.ua/rusaniv/. [Русанівський, Віталій. (2001). *Історія української літературної мови*. Київ: АртЕк]. Pobrano z: http://litopys.org.ua/rusaniv/ (dostęp: 08.07.2023)].

Rust, Maxim. (2018). Belarus's complicated memory, In: *Belarusian historical policy. New Eastern Europe*. January 2. Issue 1.

Saganovìč, Genadz'. (2003). Pryvìd nacyì ŭ ìmgle stèrèatypaŭ, *Belaruskì Gìstaryčny Aglâd*, 10(1–2), s. 281–318. [Сагановіч, Генадзь (2003). Прывід нацыі ў імгле стэрэатыпаў, *Беларускі Гістарычны Агляд*, 10(1–2), с. 281–318.

Saganovič, Gennadij. (2018). O nekotoryh složnostâh vyâvleniâ kollektivnyh identičnostej v slavânskih zemlâh VKL, W: *Narrativy Rusi konca XV – serediny XVIII v.: v poiskah svoej istorii* (s. 103–125). Moskva: ROSSPÈN. [Саганович, Геннадий (2018). О некоторых сложностях выявления коллективных идентичностей в славянских землях ВКЛ, В: *Нарративы Руси конца XV – середины XVIII в.: в поисках своей истории* (с. 103–125). Москва: РОССПЭН.

Snayder, Timothy. (2003). *The Reconstruction of Nations: Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus, 1569–1999*. New Haven & London: Yale University Press.

Svâžynskì, Uladzimir. (2001). Prablema ìdèntyfìkacyì afìcyjnaj movy Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga. Metriciana: *Dasledavannì ì matèryâly Metrykì Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga*. T. I. Athenaeum IV. Minsk: Athenaeum – Addzel specyâl'nyh gìstaryčnyh navuk ÌG NANB. [Свяжынскі, Уладзімір. (2001). *Праблема ідэнтыфікацыі афіцыйнай мовы Вялікага Княства Літоўскага. Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага*. Т. I. Athenaeum IV]. Мінск: Athenaeum – Аддзел спецыяльных

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

гістарычных навук ІГ НАНБ. Pobrano z: https://kamunikat.org/metriciana-post-9375 (dostęp: 22.08.2023).

Svâžynski, Uladzimir. (2003). Ab statuse belaruskaj ì ŭkraìnskaj moŭ u časy Vâlìkaga knâstva Lìtoŭskaga, Metriciana: *Dasledavannì ì matèryâły Metrykì Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga* T. II. Athenaeum VIII. Minsk: Athenaeum – Addzel specyâl′nyh gìstaryčnyh navuk ÌG NANB. [Свяжынскі, Уладзімір. (2003). Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага. *Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага.* Т. II. Athenaeum VIII. Мінск: Athenaeum – Аддзел спецыяльных гістарычных навук ІГ НАНБ]. Pobrano z: https://kamunikat.org/metriciana (dostęp: 22.08.2023).

Uspenskij, Boris. (1994). *Kratkiĭ očerk istorii russkogo literaturnogo âzyka (XI–XIX vv.)*. Moskva: Gnosis. [Успенский, Борис. (1994). *Краткий очерк истории русского литературного языка (XI–XIX вв.)*. Москва: Гнозис].

Vaŝuk, Dmitro. (2009). *„Abyhmo deръžali ihъ pœdlě prava ihъ zemъli" (Naselennâ Kiïvŝini ta Volinì ì velikoknâzìvs′ka vlada v XV–XVI st.)*. Kiïv: Ìnstitut ìstorìï Ukraïni NAN Ukraïni. [Ващук, Дмитро. (2009). *„Абыхмо деръжали ихъ пœдлѣ права ихъ земъли" (Населення Київщини та Волині і великокнязівська влада в XV–XVI ст.)*. Київ: Інститут історії України НАН України].

Zaprudskì, Sârgej. (2013). Nazvy belaruskaj movy ŭ pracah dasledčykaŭ pačatku XIX stagoddzâ. U: Prygodzìč, Mikalaj (red.). *Belaruskaâ mova ì movaznaŭstva: XIX stagoddze* (s. 81–110). Mìnsk: BDU. [Запрудскі, Сяргей. (2013). Назвы беларускай мовы ў працах даследчыкаў пачатку XIX стагоддзя. У: Прыгодзіч, Мікалай (рэд.). *Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе* (с. 81–110). Мінск: БДУ]. Pobrano z: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/57376/1/ %d0%97%d0%b0%d0%bf%d1%80%d1%83%d0%b4%d1%81%d0%ba%d1%96_%d0%9d%d0%b0%d0%b7%d0%b2%d1%8b%20%d0%b1%d0%b5%d0%bb%20%d0%bc%d0%be%d0%b2%d1%8b_81-111.pdf (dostęp: 08.05.2023)].

SUBMITTED: 20.06.2023
ACCEPTED: 25.11.2023
PUBLISHED ONLINE: 1.02.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Alena Rudenka – Polska, Instytut Slawistyki PAN; dr hab., profesor zwyczajny; *specjalność*: językoznawstwo; *zainteresowania naukowe*: slawistyka, komparatystyka, etnolingwistyka, semantyka historyczna.

Adres: ul. Jaracza 1, 00–378 Warszawa, Polska

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/11/2026 14:30:15

Wybrane publikacje:

1. Rudenka, A. (2020). Proper Names in Ancient Smolensk Agreements with Riga. *Onomastikas pētījumi II. Onomastic Investigations II. Starptautiskās zinātniskās konferences „Onomastikas pētījumi"* (Rīga, 2018. gada 10.–12. maijs) rakstu krājums / Proceedings of the International Scientific Conference „Onomastic Investigations" (Rīga, May 10-12, 2018). Eds. L. Balode, C. Zschieschang. Rīga: LU Latviešu valodas institūts.
2. Руденко, Е. (2020). Ранние грамоты Юго-Западной Руси. In: *Diachronie – Ethnos – Tradition: Studien zur slawischen Sprachgeschichte*. Festgabe für Anna Kretschmer. Eds. Jasmina Grković-Major, Natalia B. Korina, Stefan Michael Newerkla, Fedor B. Poljakov, Svetlana M. Tolstaja. Brno: TRIBUN EU.
3. Rudenka A. (2020). Polonisms among Belarusian names of cognitive processes. *Studia Białorutenistyczne*, 14, s. 249–268.
4. Руденка А. (2022). Пути проникновения лексических богемизмов в старорусский язык в XIV–XVII вв. *Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej*. 57. Article 2836. https://doi.org/10.11649/sfps.2836.
5. Rudenka A. (2023). What does the Internet tell the linguist about American democracy? *Ethnolinguistics. Problems of Language and Culture*, 35, pp. 261–282.